# Беларуская мова. III клас. Раздзел «Сказ»

Вывучэнне раздзела «Сказ» забяспечвае навучэнцаў неабходнымі ведамі і ўменнямі пра сказ як камунікатыўную адзінку мовы і мае на мэце падрыхтаваць іх да самастойнай пабудовы звязных вусных выказванняў.

Асноўнымі **задачамі** вывучэння гэтага раздзела ў III класе з'яўляюцца:

• знаёмства з тыпамі сказаў па мэце выказвання і інтанацыі; выпрацоўка ўменняў правільна інтанаваць апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя, клічныя сказы;

• засваенне навучэнцамі правіл пастаноўкі знакаў прыпынку ў канцы сказа; выпрацоўка ўменняў правільна афармляць на пісьме апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя, клічныя сказы;

• усведамленне вучнямі прымет галоўных і даданых членаў сказа, выпрацоўка ўменняў вызначаць галоўныя і даданыя члены сказа, сувязь слоў у сказе па пытаннях;

• удзел у дыялогах на даступныя навучэнцам тэмы з выкарыстаннем сказаў розных тыпаў, адэкватнай перадачай эмоцый, захаваннем неабходнай інтанацыі ў межах сказа.

У ходзе выканання заданняў пры вывучэнні раздзела «Сказ» трэцякласнікі практыкуюцца ў вызначэнні межаў сказаў у тэксце; знаходжанні сказаў сярод прапанаваных спалучэнняў і груп слоў; адрозніванні апавядальных, пытальных, пабуджальных, клічных сказаў у тэксце на слых; пабудове розных па мэце выказвання і інтанацыі сказаў; суаднясенні сказаў з іх схемамі; графічным выдзяленні граматычнай асновы сказа; пастаноўцы пытанняў да даданых членаў сказа; развіцці сказаў даданымі членамі па пытаннях, па малюнках; у пабудове дыялогаў і звязных маналагічных выказванняў з выкарыстаннем сказаў розных тыпаў.

## Урок 12. Прыметы сказа

***Мэты:*** узнавіць веды навучэнцаў пра асноўныя прыметы сказа, пра знакі прыпынку ў канцы сказа, развіваць інтанацыйныя навыкі, граматычны лад маўлення, лагічнае мысленне, вуснае звязнае маўленне навучэнцаў; выхоўваць здаровы лад жыцця.

***Абсталяванне:*** сігнальныя карткі, карткі з тэкстам для самастойнай працы.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Як называецца тэкст, план якога вы складалі дома? Якую добрую справу зрабілі галоўныя героі апавядання? Як гэта характарызуе іх? Колькі частак вы вылучылі ў тэксце? Прачытайце план, які ў вас атрымаўся. (Заслухоўваюцца адказы некалькіх вучняў. Адзначаюцца найбольш удалыя назвы частак тэксту.)

**II. Паўтарэнне.**

***Праца ў парах «Настаўнік — вучань».***

Адзін вучань адказвае на пытанні на с. 39, другі кантралюе правільнасць адказаў. Вучань, які выконвае ў пары ролю настаўніка, фіксуе знакам «+» на картцы правільныя адказ, а ў вуснай форме, пры неабходнасці, выпраўляе недакладнасці ў адказах напарніка. Правільнасць адказу на пытанне, якое выклікала цяжкасці, і дакладнасць выпраўлення правяраецца двума вучнямі па падручніку. Пасля таго як будуць атрыманы адказы на ўсе пытанні, кожная пара вучняў падымае сігнальную картку.

Настаўнік звяртаецца да ўсяго класа:

— Пры адказе на якое(ія) пытанне(і) ўзніклі цяжкасці? (Агучваюцца па чарзе пытанне(і), якія выклікалі цяжкасці.) Да якой тэмы трэба звярнуцца яшчэ раз, каб правільна адказаць на гэтае пытанне (пытанні)? Дзе ў падручніку знаходзіцца адказ на пытанне?

**III. Новы матэрыял.**

***1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— Успомніце, з чаго складаецца тэкст. *(Са сказаў.)* Мы пачынаем вывучаць тэму «Сказ». Сёння на ўроку прыгадаем вядомыя нам прыметы сказа.

***2. Работа па падручніку.***

Практыкаванне 60.

— Прачытайце тэкст. Вызначыце межы сказаў. Падлічыце, колькі сказаў у тэксце. (Вучні працуюць у парах. Пасля выканання задання кожная пара падымае сігнальную картку з лічбай, якая ўказвае колькасць сказаў.)

— Выразна прачытайце першы сказ (другі і г. д.). (Вучні па чарзе чытаюць сказы з паніжэннем голасу ў канцы сказа.) Што выражаецца ў кожным сказе? *(Закончаная думка.)* Перачытайце сказ, у якім перадаецца асноўная думка тэксту. Давайце запішам гэты сказ. Як трэба правільна афарміць яго на пісьме? (Адзін з вучняў гаворыць, што першае слова ў сказе трэба напісаць з вялікай літары, а ў канцы паставіць кропку. Ён выходзіць да дошкі, запісвае сказ з каменціраваннем.)

***3. Праца з рубрыкай «Завяжы вузялок!».***

— Звярніце ўвагу на рубрыку «Завяжы вузялок!». Прачытайце інфармацыю, змешчаную ў ёй, і адкажыце, што такое сказ. (Вучні самастойна перачыт-

ваюць інфармацыю, змешчаную ў рубрыцы, і даюць адказ на пытанне.)

Практыкаванне 61.

— Прачытайце. Знайдзіце сярод прапанаваных спалучэнняў і груп слоў сказы. (Вучні зачытваюць сказы.) Па якіх прыметах вы вызначылі сказы? *(Выражаюць закончаную думку, першае слова пішацца з вялікай літары, у канцы стаіць кропка, пытальнік або клічнік.)* Выпішыце сказы. (Вучні самастойна запісваюць сказы.)

— Раскажыце, якія правілы работы за камп'ютарам вы ведаеце. (Заслухоўваюцца выказванні некалькіх вучняў. Калі ў навучэнцаў узнікаюць цяжкасці, настаўнік можа нагадаць ім некаторыя правілы: 1) адлегласць ад вачэй да манітора не менш чым даўжыня выцягнутай рукі; 2) працягласць працы за камп'ютарам — не больш за 15 мінут на дзень; 3) абавязкова неабходна выконваць зрокавую гімнастыку ў перапынках паміж працай за камп'ютарам.) Ці заўсёды вы выконваеце гэтыя правілы? Чаму небяспечна парушаць іх?

— Прачытайце спалучэнні слоў, якія вы не выпісалі з практыкавання. Што трэба зрабіць, каб ператварыць іх у сказы? Вусна ўтварыце сказы. (Дзеці называюць сказы, якія ў іх атрымаліся.)

Практыкаванне 62.

— Прачытайце. Назавіце сказы, у якіх дапушчаны сэнсавыя памылкі. Выправіце памылкі і запішыце сказы. (Адзін з вучняў чытае першы сказ, выпраўляе ў ім сэнсавую памылку, выходзіць да дошкі і запісвае з каменціраваннем сказ *Вецер наляцеў на дрэвы.* Астатнія вучні працуюць у сшытках. Аналагічная праца праводзіцца з трэцім і пятым сказамі.)

**IV. Замацаванне.**

***1. Работа па падручніку.***

Практыкаванне 63.

— З асобных слоў складзіце прыказкі. Чаму так гавораць? Самастойна запішыце прыказкі. (Пасля выканання задання праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

***2. Развіццё камунікатыўных уменняў.***

Практыкаванне 64.

— Складзіце сказы па пачатку. Улічыце апісаную сітуацыю.

— Якую яшчэ запіску можна напісаць маме? *(Мама, я пайшла ... ў школу на факультатыў (на заняткі ў музычную секцыю, у кіно, гуляць з сябрамі на вуліцу).)*

— Пра што вы запытваецеся ў мамы, калі яна тэлефануе вам пасля працы? *(Мама, калі ты прыйдзеш дадому? Мама, мне пачакаць цябе ці самой рабіць урокі?)*

— З якімі святамі вы віншуеце маму? Якімі словамі вы віншуеце маму з днём нараджэння (з 8 Сакавіка, з Днём маці)?

Выразна вымавіце сказы, якія ў вас атрымаліся. (Заслухоўваюцца адказы розных вучняў. Звяртаецца ўвага на правільнасць інтанавання сказаў розных відаў.)

— Паспрабуйце скласці працяг размовы, пачатак якой апісваецца ў сітуацыі 3. Разыграйце ў парах размову мамы і дзіцяці.

***3. Самастойная работа па заданні на картках.***

Вучням раздаюцца карткі з тэкстам:

> У лесе пад елачкай вырас грыб баравік (к,К)арычневая шапка яго была моцная і пругкая (Р,р)аніцай у лес прыйшоў (к,К)астусь са сваёй сястрычкай (Н,н)аташай (я,Я)ны пачалі збіраць грыбы (Н,н)аташа падышла да елачкі і падняла ніжнія лапкі (Д,д)зяўчынка ўбачыла баравік (я,Я)кі ён прыгожы
>
> Паводле В. Хомчанкі [1]

— Прачытайце. Вызначыце межы сказаў. Пастаўце ў канцы кожнага сказа патрэбны знак прыпынку. Закрэсліце ў словах непатрэбныя літары. (Пасля выканання самастойнай работы вучнямі настаўнік прапаноўвае на дошцы правільны варыянт падзелу тэксту на сказы. Вучні праводзяць самаправерку напісанага. Калектыўна тлумачыцца правапіс вялікай літары ў словах.)

**V. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 65.

— Дома вам трэба будзе выканаць заданне, аналагічнае таму, што было прапанавана ў самастойнай рабоце.

**VI. Вынік урока.**

— Што выражаецца ў сказе? Як сказы афармляюцца на пісьме?

## Урок 13. Тыпы сказаў

***Мэты:*** паўтарыць асноўныя прыметы сказа, пазнаёміць з тыпамі сказаў па мэце выказвання, вучыць адрозніваць сказы паводле мэты выказвання, развіваць інтанацыйныя навыкі, узбагачаць слоўнікавы запас навучэнцаў словамі лексіка-семантычнай групы «музычныя інструменты», развіваць іх вуснае звязнае маўленне; выхоўваць любоў да музыкі, эстэтычныя пачуцці.

***Абсталяванне:*** карткі са словамі *пяшчотныя, мяккія, ласкавыя, лагодныя, чароўныя, моцныя, трывожныя, рэзкія, мелодыя, скрыпка, матыў, напеў, аркестр,* аўдыёзапіс мелодыі ў выкананні флейты, малюнкі флейты, зорнага неба.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Як называецца тэкст, які вы запісалі дома? Чаму ён мае такую назву? Колькі сказаў у тэксце? Прачытайце тыя з іх, якія дапамагаюць уявіць восень добрай казачнай гераіняй. (Вучні зачытваюць першы, трэці і чацвёрты сказы.) Якія літары вы ўставілі ў словы на месцы пропускаў? Якое правіла выкарысталі?

**II. Новы матэрыял.**

***1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— Па якіх прыметах можна адрозніць сказ ад набору слоў? *(Выражае закончаную думку. Першае слова ў сказе пішацца з вялікай літары, у канцы ставіцца кропка, пытальнік або клічнік. Пры вымаўленні голас паніжаецца ў канцы сказа.)* Ці

ведаеце вы, ад чаго залежыць пастаноўка знака прыпынку ў канцы сказа? (Дзеці выказваюць свае меркаванні.) Сёння на ўроку мы даведаемся пра гэта і пазнаёмімся з тыпамі сказаў.

***2. Работа па падручніку.***

Практыкаванне 66.

— Прачытайце назву тэксту. Ці ведаеце вы, што такое флейта? (Калі ў дзяцей узнікаюць цяжкасці з разуменнем слова, настаўнік паведамляе, што гэта музычны інструмент, і паказвае яго малюнак.) Паслухайце, як гучыць флейта. (Праслухоўваецца аўдыёзапіс.) З прапанаваных на дошцы слоў выберыце тыя, якія падыходзяць для апісання гукаў флейты. (На дошцы прымацаваны карткі са словамі *пяшчотныя, мяккія, ласкавыя, лагодныя, чароўныя, моцныя, трывожныя, рэзкія.*) Разгледзьце малюнак на с. 43. Як вы думаеце, пра што пойдзе размова ў тэксце? (Вучні выказваюць свае меркаванні.)

— Давайце прачытаем тэкст і праверым нашы меркаванні. (Тры вучні па чарзе зачытваюць тэкст па частках услых. Астатнія сочаць за правільнасцю вымаўлення гукаў і слоў па-беларуску.) Ці пацвердзіліся нашы меркаванні? Які музычны інструмент зачараваў Ліну? Выразна прачытайце сказ, у якім перадаецца жаданне дзяўчынкі. *(Вось бы Ліне навучыцца так іграць!)* Які знак прыпынку стаіць у канцы сказа? Знайдзіце ў тэксце сказ, у якім выражаецца пытанне. Знайдзіце і прачытайце адказ на яго. Давайце запішам гэтыя сказы. (Вучні запісваюць сказы *Адкуль жа гэтыя чароўныя гукі? На балконе суседняга дома стаяла дзяўчынка і прыціскала да вуснаў сярэбраную дудачку.* Пасля выканання задання праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

— Звярніце ўвагу на рубрыку «Завяжы вузялок!». Прачытайце інфармацыю, змешчаную ў ёй, і адкажыце, што можа выражацца ў сказе. (Вучні самастойна перачытваюць інфармацыю, змешчаную ў рубрыцы, і даюць адказ на пытанне.)

Прачытайце выдзеленае слова. Каго называюць музыкам? Як па-іншаму можна назваць таго, хто ўмее добра граць на музычным інструменце? *(Музыкант.)*

— Вымавіце слова *музыка* з націскам на іншым складзе так, каб змяніўся сэнс слова. З прапанаваных на дошцы слоў падбярыце да слова *му́зыка* блізкія па значэнні. (На дошцы прымацаваны карткі са словамі *мелодыя, скрыпка, матыў, напеў, аркестр.*) Прыдумайце сказ са словам му́зыка. (Заслухоўваюцца адказы вучняў.)

Практыкаванне 67.

— Выразна прачытайце сказы. У якім сказе выражаецца паведамленне, у якім — пытанне, у якім — пабуджэнне да дзеяння? Разгледзьце схемы да іх. Якому са сказаў адпавядае першая схема? Другая? Трэцяя?

***3. Праца з правілам.***

Настаўнік чытае правіла на с. 45.

— Якім па мэце выказвання бываюць сказы? (Дзеці перачытваюць правіла самастойна і ўзнаўляюць яго пры дапамозе апорнай схемы на форзацы падручніка.)

Выпішыце пытальны сказ з практыкавання 67. Вусна дайце поўны адказ на пытанне, якое вы запісалі. (Заслухоўваюцца адказы вучняў.)

Практыкаванне 68.

— Прачытайце сказы. Разгледзьце схемы да іх. Схема якога сказа намалявана пад лічбай 1? *(Пытальнага.)* Прачытайце сказ, якому адпавядае першая схема. Схема якога сказа намалявана пад лічбай 2? *(Апавядальнага.)* Прачытайце сказ, якому адпавядае другая схема. Схема якога сказа намалявана пад лічбай 3? *(Пабуджальнага.)* Які знак прыпынку павінен стаяць у канцы гэтага сказа? Прачытайце сказ, якому адпавядае трэцяя схема. Схема якога сказа намалявана пад лічбай 4? *(Пабуджальнага.)* Чым гэтая схема адрозніваецца ад папярэдняй? Прачытайце сказ, якому адпавядае чацвёртая схема. Давайце запішам сказы ў той паслядоўнасці, у якой размешчаны схемы. (Вучні запісваюць сказы з каменціраваннем.) Што атрымалася ў выніку спісвання? *(Тэкст.)* Якую назву можна даць тэксту? *(Сімфанічны аркестр.)*

***4. Развіццё маўлення.***

— Ці слухалі вы музычныя творы ў выкананні сімфанічнага аркестра? Дзе гэта адбывалася? Гучанне якіх музычных інструментаў вам асабліва запомнілася?

**III. Замацаванне.**

***1. Развіццё камунікатыўных уменняў.***

Практыкаванне 69.

— Зараз вы папрацуеце ў парах. Вам неабходна будзе дапоўніць размову бабулі і ўнука патрэбнымі сказамі па схемах і разыграць яе ў парах. (Заслухоўваецца некалькі дыялогаў.) Назавіце ў тэксце пабуджальны сказ.

***2. Калектыўная работа па заданні на дошцы.***

— На дошцы запісана загадка і прымацаваны малюнак зорнага неба.

На блакітнай прасціне́
зорка зорцы падмігне.
Можа, скажа нехта нам,
як завецца прасціна.

*А. Зэкаў* [2]

— Прачытайце загадку. Якую адгадку яна мае? *(Зорнае неба.)* Колькі сказаў у загадцы? Які з іх апавядальны, а які — пытальны? (Той з вучняў, які першым дае правільны адказ, выходзіць да дошкі і ставіць патрэбныя знакі прыпынку ў канцы сказаў.)

**VI. Вынік урока.**

— На якія тыпы падзяляюцца сказы па мэце выказвання? Прывядзіце прыклад апавядальнага (пытальнага, пабуджальнага) сказа.

**V. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 70.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе вусна вызначыць тыпы сказаў па мэце выказвання і выпісаць апавядальныя сказы. (Пры неабходнасці вучні калектыўна вызначаюць тыпы сказаў па мэце выказвання і адзначаюць тыя з іх, якія трэба выпісаць пры выкананні дамашняга задання.)

## Урок 14. Апавядальныя сказы

***Мэты:*** пазнаёміць з прыметамі апавядальных сказаў, іх афармленнем на пісьме, вучыць вылучаць апавядальныя сказы ў вусным і пісьмовым маўленні, правільна інтанаваць іх; выпрацоўваць пунктуацыйныя навыкі; развіваць лагічнае мысленне навучэнцаў; выхоўваць пачуццё замілавання прыродай роднага краю.

***Абсталяванне:*** малюнкі да казак «Лісіца і журавель», «Коцік, пеўнік і лісіца», «Зайкава хатка», карткі са сказамі для працы ў парах.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце сказы, якія вы выпісалі пры выкананні дамашняга практыкавання. (Адзін вучань зачытвае сказы.) Што атрымалася ў выніку спісвання? *(Тэкст.)* Якую назву можна даць тэксту. (Заслухоўваюцца розныя варыянты назваў. Робіцца вывад, што тэкст можа мець назву «Грэбень».)

**II. Паўтарэнне вывучанага.**

На дошку вывешваюцца і нумаруюцца малюнкі да казак «Лісіца і журавель», «Коцік, пеўнік і лісіца», «Зайкава хатка» (можа быць выкарыстана мультымедыйная прэзентацыя) (рыс. 1–3). У настаўніка на стале ляжаць надрукаваныя назвы казак.



Рыс. 1



Рыс. 2



Рыс. 3

***1. Калектыўная праца па заданні на дошцы.***

— Разгледзьце малюнкі. Назавіце казкі, героі якіх адлюстраваны на малюнках. (Той з вучняў, хто першым прыгадвае назву першай казкі, выходзіць да дошкі і чапляе надрукаваную назву пад адпаведным малюнкам. Аналагічная праца праводзіцца з астатнімі малюнкамі.)

***2. Праца ў парах.***

Вучням на парты раздаюцца карткі з наборам сказаў.

☐ Пеўнік, галубок, разумны лабок, адчыні! ( )
☐ Не плач, зайка. ( )
☐ Ліса наварыла кашы і размазала па талерцы. ( )
☐ Не адчыню, бо ты схопіш мяне. ( )
☐ Паеш, мой кумочак. ( )
☐ Чаго, зайка, плачаш? ( )

— А зараз вам неабходна будзе папрацаваць у парах і вызначыць, з якіх казак узяты сказы, запісаныя на картках. Сказы пазначце лічбамі 1, 2 або 3, у адпаведнасці з нумарам, які адпавядае малюнку да казкі. У дужках укажыце від сказаў па мэце выказвання: пытальны (пыт.), апавядальны (апав.), пабуджальны (пабудж.). Пасля выканання задання вучнямі настаўнік прапаноўвае праверыць выкананне задання, параўнаўшы яго з правільным адказам, прапанаваным на дошцы:

*1 — пабудж.*
*2 — пабудж.*
*3 — апав.*
*1 — апав.*
*3 — пабудж.*
*2 — пыт.*

***3. Калектыўная праца па заданні на дошцы.***

Настаўнік прапануе на дошцы (або на мультымедыйнай прэзентацыі) урыўкі з казак.

— ____________________
— Што табе трэба?
— Пазыч агню.
— Навошта?
— Буду ў печы паліць.
— ____________________
— Ды не, больш не буду хапаць.

— Прыходзь, кумочак, прыходзь, дарагі!
Ідзе Журавель да Лісы. ____________________
____________________
— ____________________
Сама гатавала!

— ____________________.
— Дык як жа мне, зайку, не плакаць? Жылі мы з лісічкаю блізка адно каля аднаго. Прыйшла лісічка, выгнала мяне з маёй хаткі і сама там жыць засталася. Вось я сяджу ды плачу.
— ____________________. Я выганю лісу з тваёй хаткі.

— Дапоўніце ўрыўкі з казак патрэбнымі сказамі, запісанымі на картках. (Вучні па чарзе дапаўняюць урыўкі патрэбнымі сказамі.) Падрыхтуйцеся да выразнага чытання па ролях урыўка з казкі. (Вучні 1-га рада рыхтуюць у парах выразнае чытанне па ролях першага ўрыўка, вучні 2-га рада — другога, вучні 3-га рада — трэцяга. Заслухоўваецца выразнае чытанне некалькіх пар вучняў.)

**III. Новы матэрыял.**

***1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— На якія тыпы падзяляюцца сказы па мэце выказвання? Сёння на ўроку мы больш падрабязна пазнаёмімся з апавядальнымі сказамі, навучымся правільна вымаўляць іх.

***2. Работа па падручніку.***

Практыкаванне 71.

— Разгледзьце малюнкі. Прачытайце сказы. Якім сказам можна падпісаць кожны малюнак? (Вучні суадносяць сказы з малюнкамі.) Які знак прыпынку стаіць ў канцы кожнага сказа? Запішыце сказы з прыназоўнікамі.

***3. Праца з правілам.***

Настаўнік чытае правіла на с. 47.

— Пра што паведамляецца ў апавядальным сказе? Які знак прыпынку ставіцца ў канцы яго?

Дзеці перачытваюць правіла самастойна і ўзнаўляюць яго.

Практыкаванне 72.

— Падзяліце тэкст на сказы. Якая інфармацыя пра матыля змешчана ў першым сказе тэксту? У другім? У трэцім? У чацвёртым? З якіх сказаў па мэце выказвання складаецца тэкст? Давайце запішам тэкст, правільна афармляючы сказы на пісьме. (Вучні запісваюць тэкст, па чарзе каменціруюць афармленне кожнага сказа на пісьме.)

— А зараз мы з вамі папрактыкуемся ў правільным вымаўленні апавядальных сказаў. (Настаўнік знаёміць вучняў з матэрыяламі рубрыкі «Завяжы вузялок!».) Што вам было ўжо вядома пра асаблівасці вымаўлення апавядальных сказаў? *(Голас павышаецца ў пачатку сказа і паніжаецца ў канцы.)* Пра што новае даведаліся? *(З большай сілай голасу вымаўляюцца галоўныя па сэнсе словы ў сказе.)*

Практыкаванне 73.

— Прачытайце адзін і той жа апавядальны сказ так, каб ён даваў адказ на тры розныя пытанні. Па стрэлках сачыце за павышэннем і паніжэннем голасу ў сказе. (Настаўнік чытае пытальныя сказы, дзеці па чарзе практыкуюцца ў правільным інтанаванні апавядальных сказаў. У далейшым праца над выразным чытаннем сказаў можа працягвацца ў парах.)

**IV. Замацаванне.**

***1. Работа па падручніку.***

Практыкаванне 74

— Прачытайце тры групы сказаў. У кожнай групе сказаў знайдзіце лішні і назавіце яго. Растлумачце свой выбар. Давайце запішам сказы, якія аказаліся лішнімі ў кожнай групе сказаў. (Усе вучні працуюць у сшытках, адзін — каля дошкі.) Выразна прачытайце сказы, якія запісалі. Што яны ўтвараюць? *(Тэкст.)* З якіх сказаў складаецца тэкст? *(З апавядальных.)* Якую назву можна яму даць? *(«Сыраежкі», «Модніцы».)* На што ўказвае прапанаваная вамі назва: на тэму тэксту ці на яго асноўную думку?

**V. Вынік урока.**

— Якія сказы называюцца апавядальнымі? Які знак прыпынку ставіцца ў канцы апавядальнага сказа? Выразна прачытайце сказ, запісаны на дошцы:

*Мы добра папрацавалі на ўроку.*

**VI. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 75.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе скласці сказы з асобных слоў і правільна аформіць іх на пісьме.

## Урок 15. Пытальныя сказы

***Мэты:*** пазнаёміць з прыметамі пытальных сказаў, іх афармленнем на пісьме, вучыць вылучаць пытальныя сказы ў вусным і пісьмовым маўленні, правільна інтанаваць іх; выпрацоўваць пунктуацыйныя навыкі; развіваць лагічнае мысленне навучэнцаў, узбагачаць іх слоўнік словамі-амонімамі; выхоўваць любоў да радзімы.

***Абсталяванне:*** малюнкі сузор'яў Вялікай і Малой Мядзведзіцы, сузор'яў Рысі і Лебедзя.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце сказы, якія ў вас атрымаліся. (Вучні зачытваюць свае варыянты першага сказа. Адзначаецца, што правільных варыянтаў некалькі: *Над полем звініць жаваранак. Жаваранак звініць над полем. Звініць над полем жаваранак.* Называецца від сказаў па мэце выказвання (апавядальныя). Аналагічна правяраюцца астатнія сказы. Тлумачыцца правапіс літар ***у-ў*** у словах *уздоўж, лугавой*.)

**II. Паўтарэнне вывучанага.**

На дошку вывешваюцца малюнкі сузор'яў Вялікай Мядзведзіцы і Малой Мядзведзіцы, Рысі, Лебедзя.

— Я задам вам некалькі пытанняў, а вы паспрабуйце даць поўныя адказы на іх з апорай на малюнкі. Выдзяляйце голасам галоўныя па сэнсе словы ў сказе: 1) Колькі яркіх зорак у сузор'і Вялікай Мядзведзіцы? 2) На што падобнае гэтае сузор'е? 3) Якое сузор'е падобнае па форме на Вялікую Мядзведзіцу?

— Якія сказы вы пабудавалі? *(Апавядальныя.)* Якія сказы называюцца апавядальнымі? Як яны вымаўляюцца? Як афармляюцца на пісьме?

**III. Новы матэрыял.**

***1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— Сёння на ўроку мы працягнем працу са сказамі, рознымі па мэце выказвання, і больш падрабязна пазнаёмімся з пытальнымі сказамі.

***2. Работа па падручніку.***

Практыкаванне 76.

— Паслухайце верш вучня. (Настаўнік чытае верш.) Колькі пытанняў у ім? Прачытайце пытанні, якія хлопчык задае сабе. Як ён адказвае на іх? А як бы вы адказалі на першае пытанне верша? (Заслухоўваюцца меркаванні вучняў пра тое, што такое родны край.)

— Спішыце выдзеленыя сказы. (Вучні самастойна запісваюць сказы.) Вызначыце іх тыпы па мэце выказвання. Які знак прыпынку вы паставілі ў канцы пытальнага сказа?

***3. Праца з правілам.***

Настаўнік чытае правіла на с. 50.

— Што выражаецца ў пытальным сказе? Які знак прыпынку ставіцца ў канцы яго?

Дзеці перачытваюць правіла самастойна і ўзнаўляюць яго.

Практыкаванне 77.

— Прачытайце самі сабе пары сказаў. Чым яны падобныя? Чым адрозніваюцца?

— Выразна прачытайце апавядальныя сказы. (Адзін з вучняў зачытвае тры сказы.) А зараз прачытайце пытальныя сказы з павышэннем голасу

на выдзеленых словах. (Вучні па чарзе зачытваюць пытальныя сказы.) Спішыце гэтыя сказы.

***4. Праца з рубрыкай «Завяжы вузялок!».***

Настаўнік засяроджвае ўвагу вучняў на тым, што ў пытальным сказе голас рэзка павышаецца на тым слове, у якім заключаецца пытанне. Вучні перачытваюць самастойна матэрыял рубрыкі.

**IV. Замацаванне.**

***1. Работа па падручніку.***

Практыкаванне 78.

— А зараз мы з вамі папрактыкуемся ў правільным вымаўленні пытальных сказаў. Прачытайце пытальны сказ з практыкавання некалькі разоў. Зрабіце гэта так, каб адказам на яго стаў па чарзе кожны з апавядальных сказаў. (Вучні па чарзе выразна зачытваюць пытальны сказ і адказ на яго.) Колькі пытанняў вы задалі? Як вам удалося задаць тры розныя пытанні, выкарыстаўшы ў сказах адны і тыя ж словы?

***2. Слоўнікавая праца.***

— Якое слоўнікавае слова сустрэлася ў практыкаванні? Паслухайце, як правільна трэба вымаўляць яго. (Настаўнік арфаэпічна правільна вымаўляе слова [шытак].) Паўтарыце ўслед за мной. (Вучні практыкуюцца ў арфаэпічна правільным вымаўленні слова.) Які гук мы чуем у пачатку слова? А якім спалучэннем літар яно пачынаецца? Якая літара галоснага гука пішацца ў спалучэнні *шы*? Чаму?

— Давайце запішам сказы, у якіх сустрэлася слоўнікавае слова. (Адзін вучань з арфаграфічным прагаворваннем запісвае сказы на дошцы, астатнія — у сшытках.)

Практыкаванне 79.

— Прачытайце загадку. Што трэба паставіць у канцы сказа? Назавіце слова-адгадку. *(Вузел.)* (Калі ў вучняў узнікаюць цяжкасці з пошукам слоў-адгадак, то настаўнік тлумачыць, што вузел — гэта не толькі пятля, сцягнутая на вяроўцы, нітцы, але і адзінка вымярэння хуткасці, роўная адной марской мілі (амаль 2 кіламетры за гадзіну). Адзінка вымярэння «вузел» прымяняецца ў мараходстве і авіяцыі.)

— Растлумачце правапіс выдзеленых літар у словах. Запішыце загадку па памяці. Не забудзьце паставіць пытальнік у канцы сказа. (Пасля выканання задання праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

**V. Вынік урока.**

— Якія сказы называюцца пытальнымі? Які знак прыпынку ставіцца ў канцы пытальнага сказа? Выразна прачытайце сказ, запісаны на дошцы:

*Ці ўсё было зразумела сёння на ўроку?*

— Дайце свой адказ на гэтае пытанне.

**VI. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 80.

— Прачытайце верш з дамашняга практыкавання. Што выклікала ў вас усмешку? Якія чайнікі пераблытаў герой верша? Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе запісаць толькі два сказы з верша, якія адпавядаюць заданню.

## Урок 16. Пытальныя сказы

***Мэты:*** пазнаёміць з пытальнымі словамі ў пытальных сказах, выпрацоўваць уменне будаваць пытальныя сказы, вылучаць іх у вусным і пісьмовым маўленні, правільна інтанаваць іх; выпрацоўваць пунктуацыйныя навыкі; развіваць звязнае вуснае маўленне навучэнцаў; выхоўваць культуру маўлення.

***Абсталяванне:*** малюнак шыны, карткі са сказамі для слоўнікавай працы.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце сказы, якія вы выпісалі. Назавіце іх тыпы па мэце выказвання. Растлумачце правапіс выдзеленых літар у словах. Калі пішацца літара ***ў***?

***Слоўнікавая праца.***

На дошку вывешваецца малюнак шыны і запісваецца рэбус:




Вучням раздаюцца карткі са сказамі:

| |
|---|
| Мама купіла сыну прыгожы ___________ |
| Які __________ трэба падрыхтаваць да ўрока |

— Разгадайце рэбус. Назавіце слоўнікавае слова. *(Сшытак.)* Дапоўніце сказы на картках слоўнікавым словам. Пастаўце ў канцы сказаў патрэбныя знакі прыпынку. (Пасля выканання задання праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.) Які з запісаных сказаў з'яўляецца апавядальным, а які — пытальным?

**II. Замацаванне.**

***1. Работа па падручніку.***

Практыкаванне 81.

— Сёння на ўроку мы працягнем знаёмства пытальнымі сказамі. Звярніцеся да практыкаванн і прачытайце сказы, прапанаваныя ў ім. Вызначы тып сказаў па мэце выказвання. Складзіце пытан да апавядальных сказаў-адказаў. Пачніце сва пытанні з прапанаваных слоў. Давайце запіша пытальныя сказы. (Адзін вучань выходзіць да дош і запісвае з каменціраваннем першы пабудаван пытальны сказ. Астатнія працуюць у сшытках. Па ля запісу сказа вучні падкрэсліваюць пытальн слова ў сказе. Аналагічная праца праводзіцца астатнімі трыма сказамі.)

***2. Праца з рубрыкай «Завяжы вузялок!».***

— Звярніце ўвагу на рубрыку «Завяжы вузялс і запомніце, што пытальныя сказы могуць утвар ца з дапамогай спецыяльных пытальных слоў *д калі, ці, хто, што, куды, колькі, як.* У такім пыта ным сказе голас павышаецца на пытальным с ве. (Вучні самастойна перачытваюць інфармац змешчаную ў рубрыцы.)

Практыкаванне 82.

— Выразна прачытайце загадкі-пытанні і адгадайце іх. (Вучні практыкуюцца ў выдзяленні голасам пытальных слоў у сказах-загадках і даюць адказ на кожнае пытанне.) Якая загадка мае дзве адгадкі? *(Што ляціць без крылаў? Думка, вецер.)* Спішыце загадкі. Падкрэсліце ў іх пытальныя словы. (Пасля запісу сказаў праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

— Якія яшчэ загадкі-пытанні вы ведаеце? (Той з вучняў, хто ўспомніць такія загадкі, загадвае іх класу. Настаўнік прапануе астатнім вучням па жаданні падрыхтаваць да наступнага ўрока яшчэ 1–2 такія загадкі.)

Практыкаванне 83.

— Выразна прачытайце пытальныя сказы. Назавіце пытальныя словы ў іх. Звярніце ўвагу на малюнкі да практыкавання і паспрабуйце даць адказы на пытанні.

— Прачытайце тэкст «Сімвалы Беларусі». Якім з пытальных сказаў трэба дапоўніць яго? Перачытайце тэкст поўнасцю. (Адзін з вучняў выразна перачытвае тэкст, астатнія сочаць за правільнасцю вымаўлення слоў і сказаў.)

— Запішыце сказ, якім дапоўнілі тэкст. Падкрэсліце ў ім пытальнае слова.

***3. Развіццё камунікатыўных уменняў.***

Практыкаванне 84.

— Уявіце сабе наступную сітуацыю: дзеці з настаўніцай упершыню прыехалі ў Мінск на хакейны матч. Нам трэба аднавіць пытанні, з якімі настаўніца вучні звярнуліся да жыхароў горада, каб трапіць на ульню. Разгледзьце ўважліва першы малюнак. Дзе находзяцца настаўніца і дзеці? *(На аўтобусным ıрыпынку.)* Пра што яны запыталіся ў мужчыны на ıрыпынку? *(Прабачце, калі ласка. Як дабрацца да нск-арэны?)* Разгледзьце ўважліва другі малюнак. е знаходзяцца настаўніца і дзеці? *(У аўтобусе.)* а што яны запыталіся ў пасажыра? *(Выбачайце, і ласка. На якім прыпынку трэба выйсці, каб піць на Мінск-арэну?)* Разгледзьце ўважліва ці малюнак. Пра што запыталася настаўніца ў ажыра каля дзвярэй? *(Ці выходзіце вы на наым прыпынку?)* Разгледзьце ўважліва чацвёралюнак. Дзе знаходзяцца настаўніца і дзеці? *білетных кас.)* Пра што настаўніца запыталася іра? *(Добры дзень. Колькі каштуе білет на ıы матч? Ці можна купіць тры білеты?)* Яшчэ ıразна вымавіце пытанні, якія мы толькі што . Назавіце пытальныя словы ў іх. (Вучні па чазываюць пытанні і пытальныя словы ў іх.)

/явіце сабе, што вы з сябрам прыйшлі ў азыграйце ў парах размову, якая адбудзеціж вамі і касірам кінатэатра. (Некалькі пар разыгрываюць сітуацыю.) Якія пытальныя ı выкарысталі ў размове? Назавіце пытальзы ў іх.

**ıнік урока.**

я сказы называюцца пытальнымі? Якімі ıмі словамі яны могуць пачынацца? Які ıынку ставіцца ў канцы пытальнага сказа? прачытайце сказ, запісаны на дошцы: *одзі карыстаюцца пытальнымі сказамі?* свой адказ на гэтае пытанне.

**IV. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 85.

— Пры выкананні дамашняга практыкаванн неабходна будзе адгадаць загадкі і выпісаць пытальныя сказы.

## Урок 17. Пабуджальныя сказы

***Мэты:*** пазнаёміць з прыметамі пабуджальн сказаў, іх афармленнем на пісьме, вучыць вылуча пабуджальныя сказы ў вусным і пісьмовым маўлен будаваць і правільна інтанаваць іх; выпрацоўва пунктуацыйныя навыкі; развіваць лагічнае мысле не навучэнцаў, узбагачаць іх слоўнік прыказкам выхоўваць бяспечныя паводзіны на дарозе.

***Абсталяванне:*** малюнак расы на траве, картк з загадкай, малюнкі дарожных знакаў «Дзікія жывё лы», «Сезонныя міграцыі земнаводных».

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Што аб'ядноўвае загадкі з дамашняга практыкавання? Якую адгадку яны маюць? *(Думка.)* Чым адрозніваюцца народная і аўтарская загадкі? *(Аўтарская загадка вершаваная, складаецца з некалькіх сказаў. Народная загадка складаецца з аднаго пытальнага сказа.)* Хто з вас падрыхтаваў загадкі-пытанні? (Падрыхтаваныя вучні загадваюць свае загадкі, астатнія адгадваюць іх. Калі вучні не знайшлі загадак, настаўнік можа прапанаваць некалькі загадак сам:

а) Што гарыць без полымя? Сонца.
б) Што бяжыць без повада? Вада, думка.
в) Што зімою камлём уверх расце? Лядзяш.
г) Без чаго хлеб не спячэш? Без скарынкі.)

— З якіх сказаў складаюцца загадкі-пытанні?

**II. Паўтарэнне вывучанага.**

***Самастойная праца па заданні на картках.***

Вучням раздаюцца карткі з загадкай:

Летняй раніцай, бывае,
плачу..ь травы лугавыя
Хто з вас, дзе..і, адгадае,
як завуцца слёзкі тыя

*А. Зэкаў* [2]

— Прачытайце і адгадайце загадку. (Калі ў вучняў узнікаюць цяжкасці са знаходжаннем словаадгадкі, настаўнік вывешвае на дошку малюнак расы на траве.) Колькі сказаў у загадцы? *(Два.)* Устаўце ў словы патрэбныя літары. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку ў канцы сказаў. (Вучні самастойна ўстаўляюць у словы прапушчаныя літары, ставяць у канцы сказаў патрэбныя знакі прыпынку. Пасля гэтага настаўнік прапаноўвае правільны варыянт выканання задання на дошцы або на слайдзе мультымедыйнай прэзентацыі, а вучні ажыццяўляюць самаправерку напісанага.)

**III. Новы матэрыял.**

***1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— Сёння на ўроку мы працягнем працу са сказамі, рознымі па мэце выказвання, і больш падрабязна пазнаёмімся з пабуджальнымі сказамі

***2. Работа па падручніку.***

Практыкаванне 86.

— Прачытайце. У якім сказе перадаецца просьба? *(У першым.)* Загад? *(У трэцім.)* Заклік? *(У чацвёртым.)* Парада? *(У другім.)* Запішыце сказ, у якім выражаецца заклік.

***3. Праца з правілам.***

Настаўнік чытае правіла на с. 56.

— Што выражаецца ў пабуджальным сказе? Які знак прыпынку можа стаяць у канцы пабуджальнага сказа?

Дзеці перачытваюць правіла самастойна і ўзнаўляюць яго.

Практыкаванне 87.

— Паслухайце верш. Якую параду дае аўтар жывёлам? Ці можна гэту параду адрасаваць людзям? Якія сказы ўжываюцца ў вершы? Выразна прачытайце верш, з большай сілай голасу вымаўляючы выдзеленыя словы. (Вучні практыкуюцца ў выразным чытанні твора.) Спішыце першы і другі сказы верша. Падкрэсліце словы, у якіх выражаецца парада. (Адзін з вучняў працуе каля дошкі, астатнія — у сшытках. Пасля запісу сказаў дзеці падкрэсліваюць у іх словы *не перабягай, не бяжы, асцярожна*.)

***4. Праца з рубрыкай «Завяжы вузялок!».***

Настаўнік засяроджвае ўвагу вучняў на тым, што ў пабуджальным сказе голас павышаецца на тым слове, у якім заключаецца пабуджэнне да дзеяння. Вучні перачытваюць самастойна матэрыял рубрыкі.

***5. Праца па развіцці маўлення.***

— Ці ведаеце вы дарожныя знакі, якія папярэджваюць вадзіцеляў, што на дарогу могуць выбягаць жывёлы? Апішыце, як выглядаюць гэтыя знакі (рыс. 4, 5). (Настаўнік выслухоўвае адказы вучняў, вывешвае на дошку знакі, паведамляе дзецям іх назвы і гаворыць пра тое, што першы знак папярэджвае вадзіцеляў аб магчымасці выхаду на дарогу кабана, лася, аленя, паколькі гэты ўчастак дарогі можа ўваходзіць у маршрут руху жывёл, а другі — што на ўчастку дарогі магчыма масавае з'яўленне земнаводных, у прыватнасці жаб.)



*Рыс. 4.* Дзікія жывёлы



*Рыс. 5.* Сезонныя міграцыі земнаводных

**IV. Замацаванне.**

***Работа па падручніку.***

Практыкаванне 88.

— Разгледзьце малюнкі на с. 57. Якія правілы бяспечных паводзін на дарозе і побач з ёй вы ведаеце? (Выслухоўваюцца адказы вучняў.) Складзіце па малюнках пабуджальныя сказы-парады, якія можна даць вучням. (Навучэнцы складаюць пабуджальныя сказы па пачатку.) Давайце запішам два сказы. (Вучні калектыўна вырашаюць, якія сказы будуць запісваць.)

Практыкаванне 89.

— З прапанаваных частак састаўце і запішыце прыказкі. Чаму так гавораць? Апавядальнымі ці пабуджальнымі сказамі з'яўляюцца прыказкі? Што ў іх выражаецца: просьба ці парада? *(Парада.)* Выразна прачытайце прыказкі, з большай сілай голасу вымаўляючы выдзеленыя словы. (Вучні практыкуюцца ў выразным вымаўленні пабуджальных сказаў.)

**V. Вынік урока.**

— Якія сказы называюцца пабуджальнымі? Які знак прыпынку можа стаяць у канцы пабуджальнага сказа? Выразна прачытайце сказ, запісаны на дошцы:

*Абавязкова вывучыце правіла перад выкананнем задання.*

**VI. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 90.

— Прачытайце верш з дамашняга практыкавання. Якое значэнне мае слова *плён*? З якімі парадамі звяртаецца паэт да чытачоў? Якія сказы ён выкарыстоўвае ў вершы? Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе запісаць адну з парад, устаўляючы ў словы патрэбныя літары.

## Урок 18. Пабуджальныя сказы

***Мэты:*** адпрацоўваць уменні вылучаць пабуджальныя сказы ў вусным і пісьмовым маўленні, будаваць і правільна інтанаваць іх; выпрацоўваць пунктуацыйныя навыкі; развіваць звязнае вуснае маўленне навучэнцаў; выхоўваць клапатліва стаўленне да сваякоў.

***Абсталяванне:*** малюнкі кропа, ноты ля, кропл

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце параду, якую вы запісалі. (Высл хоўваюцца адказы двух вучняў, якія запісалі розн парады.) Якія літары вы ўставілі ў словы? Чаму?

— Якія ветлівыя словы і пажаданні сваякам м на выкарыстоўваць раніцай.

**II. Замацаванне.**

***1. Работа па падручніку.***

Практыкаванне 91.

— Выразна прачытайце першую групу ска Знайдзіце ў ёй пабуджальны сказ. Давайце зап яго. (Той з вучняў, хто першым назваў патр сказ, выходзіць да дошкі і запісвае яго. Аст працуюць у сшытках. Аналагічная праца правод з астатнімі групамі сказаў.) Прачытайце яшчэ р буджальныя сказы. (Вучні выразна чытаюць.) з іх перадаецца просьба? Загад? Запрашэнне

Практыкаванне 92.

— А зараз мы з вамі павучымся разгадваць ды. Магчыма, хтосьці з вас ведае, што такое і як яе разгадаць? (Заслухоўваюцца адказы Калі дзеці не ведаюць адказу на гэтае пыта настаўнік паведамляе ім, што шарада — гэт ка, у якой слова-адгадка падзяляецца на частак, кожная з якіх з'яўляецца асобным сл

— Прачытайце шараду. (Адзін з вучня тэкст.) З апорай на малюнак назавіце назву паверхневай часткі дрэва. *(Кара.)*

з апорай на малюнак назавіце неглыбокае месца на рацэ, дзе плаваюць маленькія дзеці. *(Мель.)* Якое слова атрымаецца, калі злучыць часткі *кара* і *мель? (Карамель — цвёрдыя цукеркі.)* Давайце запішам слова-адгадку.

— З якіх сказаў складаецца шарада? Выразна перачытайце іх, з большай сілай голасу вымаўляючы выдзеленыя словы. (Вучні практыкуюцца ў выразным чытанні пабуджальных сказаў.)

***2. Развіццё маўлення.***

— Давайце ўсе разам паспрабуем прыдумаць шараду, выкарыстаўшы малюнкі (рыс. 6) і частку сказа:



*Рыс. 6*

... агародную складзіце з ... вы,
каб атрымаць у выніку часцінку ... .

(Спачатку вучні называюць прадметы на малюнку: *кроп, нота ля,* потым складваюць часткі *кроп* + *ля* і атрымліваюць слова *кропля.* Далей дзеці спрабуюць дапоўніць сказ патрэбнымі словамі: ***Расліну*** *агародную складзіце з* ***нотай*** *вы, каб атрымаць у выніку часцінку* ***вады.***)

***3. Работа па падручніку.***

Практыкаванне 93.

— Зараз мы пазнаёмімся яшчэ з некаторымі творамі, у якіх выкарыстоўваюцца пабуджальныя сказы. У слоўніку знайдзіце значэнне слова *заклічка.* Прачытайце вершаваныя радкі. (Вучні чытаюць заклічку і калыханку.) Калі вымаўляюць або спяваюць гэтыя творы? Які з іх з'яўляецца заклічкай, а які калыханкай? Па якіх сказах вы пра гэта здагадаліся? Прачытайце іх. У якім з тэкстаў усе сказы пабуджальныя? Запішыце заклічку. (Вучні працуюць самастойна. Пасля запісу заклічкі праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

***4. Праца з рубрыкай «Гавары правільна!».***

— Прачытайце спалучэнні слоў, змешчаныя ў рубрыцы. Паспрабуйце скласці з адным з іх пабуджальны сказ. Напрыклад: *Давайце ліць ваду ў бочку.* або *Таня, лі ваду ў бочку.* (Вучні практыкуюцца ў складанні і правільным вымаўленні пабуджальных сказаў.)

***5. Развіццё камунікатыўных уменняў.***

Практыкаванне 94.

— Разгледзьце малюнак на с. 60. Што робіць мама? Вусна дапоўніце размову мамы і дачушкі патрэбнымі сказамі па схемах. Выразна вымавіце пабуджальны сказ. *(Пакалышы Міхаську.)* Што ў ім выражаецца: просьба ці парада? *(Просьба.)* Прыгадайце творы з папярэдняга практыкавання і скажыце, якую калыханку дзяўчынка можа праспяваць брацiку. Разыграйце размову мамы і Машы ў парах. (Заслухоўваецца некалькі дыялогаў.)

**III. Вынік урока.**

— Якія сказы называюцца пабуджальнымі? Які знак прыпынку можа стаяць у канцы пабуджальнага сказа? У якіх творах часта сустракаюцца пабуджальныя сказы? *(Заклічкі, калыханкі, шарады, прыказкі.)*

**IV. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 95.

— Выразна прачытайце заклічкі, з большай сілай голасу вымаўляючы выдзеленыя словы. З якіх сказаў яны складаюцца? Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе запісаць і вывучыць толькі тую заклічку, якая адпавядае заданню.

## Урок 19. Клічныя сказы

***Мэты:*** пазнаёміць з прыметамі клічных сказаў, іх афармленнем на пісьме, вучыць вылучаць клічныя сказы ў вусным і пісьмовым маўленні, будаваць і правільна інтанаваць іх; выпрацоўваць пунктуацыйныя навыкі; развіваць мысленне, вуснае звязнае маўленне навучэнцаў, цікавасць да традыцый беларусаў; выхоўваць жаданне захоўваць традыцыі народа.

***Абсталяванне:*** схемы сказаў, карткі са сказамі для самастойнай працы.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Выразна вымавіце заклічку, якую вы запісалі дома. (Праводзіцца конкурс на лепшага чытальніка заклічкі.)

**II. Паўтарэнне.**

***1. Самастойная работа па заданні на картках.***

На дошцы вывешваюцца схемы сказаў:

1) [пыт.]? 2) [апав.]. 3) [апав.]! 4) [пабудж.].

Вучням раздаюцца карткі са сказамі для самастойнай працы:

☐ Чалавек з добрым зрокам здольны разгледзець некалькі тысяч іх. ☐ Колькі зорак можна ўбачыць на небе ноччу? ☐ Часцей углядайцеся ў начное неба, адкрывайце яго таямніцы. ☐ А з дапамогай моцнага тэлескопа можна сфатаграфаваць мільярд зорак!

— Прачытайце сказы на картках і разгледзьце схемы да іх, змешчаныя на дошцы. Як вы думаеце, якое заданне трэба сфармуляваць да практыкавання на картках? (Вучні спрабуюць сфармуляваць заданне. Заслухоўваецца некалькі варыянтаў адказаў. Дзеці калектыўна прыходзяць да высновы, што ў практыкаванні трэба размясціць сказы ў той паслядоўнасці, у якой размешчаны схемы сказаў на дошцы. У пустых квадрацiках трэба паставіць той нумар сказа, які адпавядае нумару схемы.) Расстаўце патрэбныя лічбы ў пустых квадратах. (Вучні самастойна вызначаюць тыпы сказаў па мэце выказвання і суадносяць іх са схемамі.) Прачытайце сказы ў той паслядоўнасці, у якой размешчаны схемы да іх. (Правяраецца правільнасць выканання задання.) Што атрымалася ў выніку чытання? *(Тэкст.)* Якую назву можна даць тэксту? (Заслухоўваюцца варыянты назваў, прапанаваныя

дзецьмі, напрыклад: *«Таямніцы начнога неба» «Колькі зорак на небе?».*)

***2. Абагульняючая гутарка.***

— Якімі бываюць сказы па мэце выказвання? Які сказ называецца апавядальным? Пытальным? Пабуджальным? Які знак прыпынку ставіцца ў канцы апавядальнага сказа? Пытальнага? Клічнага?

**III. Новы матэрыял.**

***1. Паведамленне тэмы і пастаноўка мэты ўрока.***

— Сёння на ўроку мы пазнаёмімся з вамі з клічнымі сказамі і даведаемся, калі апавядальныя, пытальныя і пабуджальныя сказы становяцца клічнымі.

***2. Работа па падручніку.***

Практыкаванне 96.

— Разгледзьце малюнак на с. 61. Выразна прачытайце сказы пад малюнкам з улікам паметак у слупку справа. (Вучні практыкуюцца ў парах у выразным чытанні сказаў.) Разгледзьце малюнак у версе старонкі 62. Выразна прачытайце сказы пад малюнкам з улікам паметак у слупку справа. (Вучні практыкуюцца ў парах у выразным чытанні сказаў. Аналагічная праца праводзіцца з трэцім малюнкам і групай сказаў, запісанай пад ім.)

— А зараз прачытайце сказы, у якіх выражаецца пытанне. Які з іх вымаўляецца з моцным пачуццём? *(Ты атрымаў дзясятку?!)* Што стаіць у канцы гэтага сказа? Давайце запішам яго.

Прачытайце сказы, у якіх выражаецца паведамленне. Якія з іх вымаўляюцца з моцным пачуццём? *(Я атрымаў за дыктант дзясятку! Малайчына, сынок!)* Што стаіць у канцы гэтых сказаў? Давайце запішам іх.

— Прачытайце сказы, у якіх выражаецца запрашэнне да дзеяння. Якія з іх вымаўляюцца з моцным пачуццём? *(Паўлік, сядай хутчэй за стол! Паглядзі, які мы з мамай пірог спяклі!)* Што стаіць у канцы гэтых сказаў? Давайце запішам іх.

***3. Праца з правілам.***

Настаўнік чытае правіла на с. 63.

— Які сказ называецца клічным? Які знак прыпынку ставіцца ў канцы апавядальнага клічнага і пабуджальнага клічнага сказаў? Якія знакі прыпынку ставяцца ў канцы пытальнага клічнага сказа?

Дзеці перачытваюць правіла самастойна і ўзнаўляюць яго.

Практыкаванне 97.

— Выразна прачытайце сказы. Звярніце ўвагу на знакі прыпынку ў канцы іх. (Вучні практыкуюцца ў выразным чытанні сказаў.) Назавіце спачатку апавядальныя сказы, потым — пытальныя, потым — пабуджальныя. Якія з іх з'яўляюцца клічнымі? Выпішыце пытальны клічны сказ.

***4. Праца з рубрыкай «Завяжы вузялок!».***

Настаўнік паведамляе, што любы па мэце выказвання сказ, вымаўлены з моцным пачуццём, становіцца клічным. Ён звяртае ўвагу на тое, што клічныя сказы вымаўляюцца больш высокім тонам з выдзяленнем слова, якое выражае пачуццё радасці, гневу, захаплення, удзячнасці, здзіўлення.

Вучні перачытваюць самастойна матэрыял рубрыкі.

***5. Развіццё маўлення.***

— Хто з вас ужо быў на экскурсіі ў Дудутках? Што вас там асабліва ўразіла, што запомнілася? (Вучні, якія былі ў музеі, дзеляцца сваімі ўражаннямі.) Раскажыце, што вы ведаеце пра музей старажытных рамёстваў «Дудуткі». Якія святы там праходзяць? (Настаўнік у гэты час можа паказаць прэзентацыю, прысвечаную музею «Дудуткі».)

**IV. Замацаванне.**

***Работа па падручніку.***

Практыкаванне 98.

— Выразна прачытайце клічныя сказы. Якія з іх з'яўляюцца апавядальнымі, якія — пытальнымі, а якія — пабуджальнымі? (Вучні па чарзе чытаюць сказы, вызначаюць іх тып па мэце выказвання.) Давайце запішам пабуджальныя клічныя сказы. (Адзін з вучняў працуе каля дошкі, астатнія ў сшытках.)

**V. Вынік урока.**

— Якія сказы называюцца клічнымі? Якія знакі прыпынку ставяцца ў канцы клічных сказаў? Выразна прачытайце сказы, запісаныя на дошцы:

*Як добра працаваць разам з сябрамі!*

*Заўсёды дапамагайце сябрам!*

*У вас столькі сяброў?!*

**VI. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 99.

— Прачытайце верш з дамашняга практыкавання. На што ён падобны: на заклічку ці на лічылку? Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе спісаць тэкст, устаўляючы ў словы патрэбныя літары, знайсці ў ім пабуджальныя сказы і падкрэсліць іх. Да наступнага ўрока навучыцеся выразна чытаць верш.

## Урок 20. Клічныя сказы

***Мэты:*** адпрацоўваць уменне будаваць клічныя сказы, вылучаць іх у вусным і пісьмовым маўленні, правільна інтанаваць іх і афармляць на пісьме; выпрацоўваць пунктуацыйныя навыкі; развіваць мысленне, звязнае пісьмовае маўленне навучэнцаў; выхоўваць любоў да радзімы, культуру маўлення.

***Абсталяванне:*** віншавальныя паштоўкі, карткі з літарамі ***т, ц, д, дз***.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Выразна прачытайце верш, які вы запісалі дома. (Адзін вучань чытае верш.) Назавіце клічныя сказы, якія сустрэліся ў вершы. Пакажыце картку з той літарай, якую вы ўставілі ў слова *у(ц/т)ячы (бу(д/дз)ем, оха(т/ц)ь)*.

**II. Новы матэрыял.**

***1. Работа па падручніку.***

Практыкаванне 100.

— Разгледзьце малюнкі. Выразна прачытайце сказы. Да якога з малюнкаў падыходзіць кожны сказ? Якім словам пачынаюцца першы і другі сказы? Трэці і чацвёрты? Назавіце клічныя сказы. Якія пачуцці (захапленне, здзіўленне, смутак, вялікае задаваль-

ненне) у іх перадаюцца? Спішыце клічныя сказы. Падкрэсліце слова, з якога пачынаецца кожны сказ.

***2. Праца з рубрыкай «Завяжы вузялок!».***

— Настаўнік паведамляе, што клічныя сказы могуць пачынацца словамі *колькі, як, які, эх, ай, о, няхай (хай), дык*, якія дапамагаюць перадаць пачуцці радасці, гневу, захаплення, удзячнасці, здзіўлення.

Вучні перачытваюць самастойна матэрыял рубрыкі.

**III. Замацаванне.**

***1. Работа па падручніку.***

Практыкаванне 101.

— Выразна прачытайце верш. Звярніцеся да слоўніка ў практыкаванні. Што такое *лёс*? Якая спадчына нам засталася ад продкаў? *(Краіна, дзе мы жывём, мова.)* Як яе захаваць і перадаць іншым пакаленням?

— Колькі сказаў у вершы? Вызначыце іх тып па мэце выказвання. Які са сказаў з'яўляецца клічным? Спішыце пытальны клічны сказ. Падкрэсліце слова, якім ён пачынаецца.

***2. Развіццё маўлення.***

На дошку вывешваюцца віншавальныя паштоўкі (рыс. 7).

Практыкаванне 102.

— Прачытайце віншаванне. Разгледзьце паштоўкі, змешчаныя на дошцы. На якіх паштоўках можна запісаць гэтае віншаванне. Якія паштоўкі лішнія? Растлумачце свой выбар. (Той з вучняў, хто першым называе лішнюю паштоўку, выходзіць да дошкі і прыбірае яе. Па чарзе да дошкі выходзяць тры вучні.) Яшчэ раз сам сабе перачытайце віншаванне. Назавіце ў ім пабуджальны клічны сказ. Якім словам ён пачынаецца? *(Няхай.)*

— З чым людзі могуць павіншаваць адзін аднаго? (Выслухоўваюцца меркаванні некалькіх вучняў.) Па ўзоры, прапанаваным у практыкаванні, складзіце віншаванне аднаму са сваіх сваякоў. Запішыце віншаванне. (Кожны вучань працуе самастойна. Пасля выканання задання праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

Практыкаванне 103.

— Прачытайце вершаваныя радкі з моцным пачуццём радасці. (Некалькі вучняў практыкуюцца ў выразным чытанні.) Якія гукі часта паўтараюцца ў словах сказа? Які знак прыпынку трэба паставіць у канцы сказа?

— Запішыце сказ па памяці. (Пасля выканання задання праводзіцца самаправерка напісанага. Настаўнік нагадвае вучням пра неабходнасць пастаноўкі знака прыпынку ў канцы сказа.)

**IV. Вынік урока.**

— Якія сказы называюцца клічнымі? Якімі словамі яны могуць пачынацца? Якія знакі прыпынку ставяцца ў канцы клічных сказаў? Прачытайце сказы, запісаныя на дошцы:

*Колькі вучняў сабралася ў зале?*
*Колькі вучняў сабралася ў зале?!*
*Колькі вучняў сабралася ў зале!*

— Чым падобныя і чым адрозніваюцца гэтыя сказы?

**V. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 104.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання вам неабходна будзе запісаць сказы, паставіць у канцы іх патрэбныя знакі прыпынку, знайсці і падкрэсліць словы, з якіх пачынаюцца гэтыя сказы.




*Рыс. 7*

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Хомчанка, В.* Чырвоныя ягады : апавяданні : для малодш. шк. узросту / уклад. Н. С. Мінкевіч ; маст. К. С. Ракіцкі, А. Г. Званароў. — Мінск : Юнацтва, 1999. — 431 с. — С. 16.
2. *Зэкаў, А.* Кенгуру ці кенгура? : казкі і вершы : для мал. шк. узросту / Анатоль Зэкаў. — Мінск : Нар. асвета, 2013. — 94 с.

**Крыніцы ілюстрацый** http://malchishki-i-devchonki.ru/skazka-petushok-greb2.jpg; http://stotysyhc.ru/wp-content/uploads/2016/10/zajka10.jpg; https://encrypted-tbn2.gstatic.com/images?q=tbn:ANd9GcSlV9mc0SJPRRpC7POO_6VruKz8eCqOgBfx3eyfq9tCgNcm2mLd0jWVD5Y; http://www.avtoshina-nsk.ru/img/d16/big/156k.jpg; http://yamo.adm.yar.ru/upload/iblock/66b/dg.png; http://belkairos.com/wp-content/uploads/znak_1.35_rb_sezonnye_migracii_zemnovodnyh.jpg; https://i.mycdn.me/image; http://cdn01.ru/files/users/images/02d1.jpg; https://vignette2.wikia.nocookie.net/shipoffools/images/a/a8/Water-droplet-icon.jpg/revision/latest; https://www.google.by/imgres; https://symbal.by/t/450-pastouka-z-dniom-naradzennia/; http://vid.stolin.edu.by/be/main.aspx?guid=2071

***Свірыдзенка В. І.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры беларускага і рускага мованазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ*